**ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2023/2024 навучальны год**

**Комплексная работа**
**9 клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Адзначце правільныя сцверджанні:**

*Колькасць балаў – 6*

1. Граматычная аснова сказа можа складацца з аднаго члена сказа – дзейніка або выказніка.
2. Калі дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне, паміж імі заўсёды ставіцца працяжнік.
3. У слове 'дождж' чатыры гукі.
4. Дзеепрыслоўе – асобая нязменная форма дзеяслова.
5. Акцэнталагічныя нормы рэгулююць месца размяшчэння націску ў словах.
6. Асноўныя адзінкі сінтаксісу – слова, словазлучэнне, сказ і тэкст.
7. Пры змяненні слова (напрыклад, скланенні назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў) утвараюцца формы аднаго і таго слова.
8. Словы ў словазлучэннях звязаны двума відамі падпарадкавальнай сувязі: дапасаваннем і прымыканнем.
9. Паводле паходжання прыназоўнікі падзяляюцца на вытворныя і невытворныя.
10. Паводле мэты выказвання сказы бываюць апавядальныя, пытальныя і клічныя.

**Заданне 2. Размяркуйце словы па слупках табліцы ў адпаведнасці з колькасцю зычных гукаў.**

*Колькасць балаў – 6*

Здань, з’езд, яечка, іхні, салаўі, добрушскі, ездзіць, спяваюць, дождж, раскінуць, дзюба, мільярд, дзесьці, французскі.

***Увага! Ёсць”лішнія”словы.***

| 3 зычныя гукі | 4 зычныягукі | 5 зычных гукаў |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**Заданне 3. Выпішыце нумары пар слоў, якія ў залежнасці ад месца націску адрозніваюцца лексічным значэннем.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| 1. Дзікі – дзікі | 6. Насып – насып |
| 2. Трактарам – трактарам | 7. Завяла – завяла |
| 3. Пагрузіць – пагрузіць | 8. Дугі – дугі |
| 4. Зачыніцца – зачыніцца | 9. Замкі – замкі |
| 5. Вазы – вазы | 10. Берагу – берагу |

**Адказ: __________________________**

**Заданне 4. Узнавіце фразеалагізмы з кампанентам "хадзіць" на аснове прапанаванага значэння.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Хадзіць… | Мець бравы, незалежны выгляд, трымацца зухавата. |
| Хадзіць каля… | Есці з апетытам і да канца ўсё, што даюць. |
| Хадзіць на… | Слепа падпарадкоўвацца чыёй-небудзь волі, дзейнічаць несамастойна. |
| Хадзіць на … | Вельмі сваволіць, дурэць; рабіць, што захочацца. |
| Хадзіць па … | Рызыкаваць жыццём, быць у небяспецы. |
| Хадзіць на … | Прыслугоўваць, дагаджаць. |

**Заданне 5. Перакладзіце словы на беларускую мову. Запішыце.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Адажио | |
| Океан | |
| Аттракцион | |
| Диалог | |
| Астероид | |
| Аккордеонист | |

**Заданне 6. Дапішыце канчаткі назоўнікаў.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Беларускага народ… | |
| Посуд з крыштал… | |
| З курс… фізікі | |
| Пяць хвілін да ўваход… | |
| Майстар пейзаж… | |
| Смачнага мядк… | |

**Заданне 7. Падкрэсліце выдзеленыя курсівам словы як члены сказа. Вызначце разрад займеннікаў.**

*Колькасць балаў – 6*

| Сказ | Разрад займенніка |
|---|---|
| *Чым* жа ўсё-такі пахне зямля? | |
| Свой адметны пах мае *кожная* пара года. | |
| *Нехта* незнаёмы сустрэў Васіля на прыпынку. | |
| Ёсць пытанні, якія чалавек павінен задаць *сабе* самому. | |
| *Якое* вялікае неба! | |
| Заўсёды добра пераказваць *чыесьці* думкі. | |

**Заданне 8. Падкрэсліце "чацвёртае лішняе".**

*Колькасць балаў – 6*

1. Дзеяслоў, прошлы час, род, асоба.
2. Прыметнік, адносны, прыналежны, няпэўны.
3. Прыслоўе, ступень параўнання, канчатак, акалічнаснае.

**Заданне 9. Вызначце назву твора, вершаваны памер, сродкі мастацкай выразнасці (выдзеленыя словы).**

*Колькасць балаў – 6*

| Урывак з твора | Назва твора | Вершаваны памер | Сродкі мастацкай выразнасці |
|---|---|---|---|
| Па-над белым пухам вішняў,<br>***Быццам сіні аганёк,***<br>Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі<br>Сінякрылы матылёк. | | | |
| З усіх сабораў ёсць сабор,<br>дзе згодзен я маліцца; | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| у ***спелым*** лецe, спелы бор, звіняць твае званіцы. | | | |

**Заданне 10. Насупраць сцверджання пастаўце знак + (плюс), калі яно праўдзівае, або знак – (мінус), калі яно не адпавядае ісціне.**

*Колькасць балаў – 6*

| Сцверджанне | +\- |
|---|---|
| Пісьменнік Максім Лужанін працаваў асабістым сакратаром Якуба Коласа. | |
| Максім Багдановіч адзін з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да класічных формаў верша. | |
| Якуб Колас пісаў толькі вершаваныя творы. | |
| Васіль Быкаў быў навучэнцам Віцебскага мастацкага вучылішча. | |
| Кузьма Чорны – сапраўднае імя пісьменніка. | |
| Свае першыя вершы Янка Купала напісаў на рускай мове. | |

**Комплексная работа**
**9 клас**

## ДАВЕДКІ

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **6** | **60** |

**Заданне 1**. 1, 3, 4, 5, 7, 9

**Заданне 2.**

| 3 зычныя гукі | 4 зычныя гукі | 5зычных гукаў |
|---|---|---|
| Здань | з’езд | добрушскі |
| іхні | яечка | спяваюць |
| дождж | салаўі | раскіуць |
| дзесьці | ездзіць | мільярд |

**Заданне 3**. 1, 5, 6, 7, 9, 10

**Заданне 4.**

| | |
|---|---|
| Хадзіць козырам (гогалем) | Мець бравы, незалежны выгляд, трымацца зухавата. |

| | |
|---|---|
| Хадзіць каля посуду | Есці з апетытам і да канца ўсё, што даюць. |
| Хадзіць на павадку | Слепа падпарадкоўвацца чыёй-небудзь волі, дзейнічаць несамастойна. |
| Хадзіць на галаве (на галовах) | Вельмі сваволіць, дурэць; рабіць, што захочацца. |
| Хадзіць па лязе | Рызыкаваць жыццём, быць у небяспецы. |
| Хадзіць на задніх лапках | Прыслугоўваць, дагаджаць. |

**Заданне 5.**

| | |
|---|---|
| Адажио | адажыа |
| Океан | акіян |
| Аттракцион | атракцыён |
| Диалог | дыялог |
| Астероид | астэроід |
| Аккордеонист | акардэаніст |

**Заданне 6.**

| |
|---|
| Беларускага народа |
| Посуд з крышталю |
| З курса фізікі |
| Пяць хвілін да ўваходу |
| Майстар пейзажа |
| Смачнага мядку |

**Заданне 7.**

| Сказ | Разрад займенніка |
|---|---|
| *Чым* жа ўсё-такі пахне зямля? **Дапаўненне** | Пытальны |
| Свой адметны пах мае *кожная* пара года. **Азначэнне** | Азначальны |
| *Нехта* незнаёмы сустрэў Васіля на прыпынку. **Дзейнік** | Няпэўны |
| Ёсць пытанні, якія чалавек павінен задаць *сабе* самому. **Дапаўненне** | Зваротны |
| *Якое* вялікае неба! **Азначэнне** | Адносны |
| Заўсёды добра пераказваць *чыесьці* думкі. **Азначэнне** | Няпэўны |

**Заданне 8.**

1. Дзеяслоў, прошлы час, род, асоба.
2. Прыметнік, адносны, прыналежны, няпэўны.
3. Прыслоўе, ступень параўнання, канчатак, акалічнаснае.

**Заданне 9. Вызначце назву твора, вершаваны памер, сродкі мастацкай выразнасці (выдзеленыя словы).**

| Урывак з твора | Назва твора | Вершаваны памер | Сродкі мастацкай выразнасці |
|---|---|---|---|
| Па-над белым пухам вішняў,<br>*Быццам сіні аганёк*,<br>Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі<br>Сінякрылы матылёк. | "Маёвая песня" ("Па-над белым пухам вішняў…) | Харэй | Параўнанне |
| З усіх сабораў ёсць сабор,<br>дзе згодзен я маліцца;<br>у *спелым* леце, спелы бор,<br>звіняць твае званіцы. | "Спелы бор" | Ямб | Эпітэт |

**Заданне 10. Насупраць сцверджання пастаўце знак + (плюс), калі яно праўдзівае, або знак – (мінус), калі яно не адпавядае ісціне.**

| Сцверджанне | +\- |
|---|---|
| Пісьменнік Максім Лужанін працаваў асабістым сакратаром Якуба Коласа. | + |
| Максім Багдановіч адзін з першых у беларускай літаратуры звярнууўся да класічных формаў верша. | + |
| Якуб Колас пісаў толькі вершаваныя творы. | - |
| Васіль Быкаў быў навучэнцам Віцебскага мастацкага вучылішча. | + |
| Кузьма Чорны – сапраўднае імя пісьменніка. | - |
| Свае першыя вершы Янка Купала напісаў на рускай мове. | - |